# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 7 (27) Люты 2016**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*


## А ў душы такія ж…

**ШОСТАГА ЛЮТАГА АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА ВЫПУСКНІКОЎ У НАШАЙ ШКОЛЕ. БЫЛЫХ ВУЧНЯЎ ЧАКАЛА ЦЁПЛАЯ АТМАСФЕРА СЯБРОЎСТВА, ЛЮБОВІ І ДЗІЦЯЧЫЯ ЎСМЕШКІ.**

**ПАЧАЛОСЯ МЕРАПРЫЕМСТВА… І КОЖНЫ, ЗАТАІЎШЫ ДЫХАННЕ, ЧАКАЎ ЦУДАЎ, ЯКІЯ, ДАРЭЧЫ, УВЕСЬ ВЕЧАР НЕ ДАВАЛІ СУМАВАЦЬ.**

**ЯК ЗАЎСЁДЫ, ПАЧАЛОСЯ ЎСЁ З ПЕРАКЛІЧКІ, УСПАМІНАЛІ ЎСІХ ПЕДАГОГАЎ. ДЛЯ УСІХ ПРЫСУТНЫХ ГУЧАЛІ ПЕСНІ, ЛАДЗІЛІСЯ ТАНЦЫ, ШКОЛЬНАЯ КАМАНДА КВЗ ПАКАЗАЛА СВАЕ МІНІЯЦЮРЫ.**

**ЦІКАВА, А ЯКІ Ж НАСТРОЙ У ВЫПУСКНІКОЎ, ШТО ЯНЫ ЎСПАМІНАЮЦЬ СА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ?**








*Ліпаў Алег Валер’евіч,*
*25 год пасля заканчэння школы:*

- Я і сёння памятаю, як мы ў школьны час каталіся на лодках па рэчцы, як нас вазілі ў Пагост. А калі вучыліся ў другую змену, то разам з сябрамі замест заняткаў калолі ў мяне дровы. З дзяцінства марыў зусім пра іншае, але паступіў у ваеннае вучылішча, і сёння я – падпалкоўнік! І я ганаруся гэтым!

*Саскавец Наталля Уладзіміраўна,*
*20 год пасля заканчэння школы:*

- Школа заўсёды была месцам для адпачынку душы. Мы вельмі любілі рускую літаратуру, бо атрымлівалі шмат добрых і пазітыўных эмоцый. Былі настаўнікі, якія поўнасцю нам “дарылі сябе”: Людміла Уладзіміраўна, Святлана Віктараўна.

*Ждановіч Алена Якаўлеўна,*
*20 год пасля заканчэння школы:*

- Я памятаю кожнае імгненне. Я прыйшла ў школу - і адчуваю хваляванне. Школа – месца, дзе мяне навучылі быць чалавекам. А такія ўрокі, як літаратура і гісторыя, пакінулі вялікі адбітак у маім сэрцы.

*(Заканчэнне на 2 старонцы)*

**_Дом, у якім утульна ўсім!_**

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 27, люты 2016 г.***








*(Заканчэнне. Пачатак на 1 старонцы)*

*<u>Грушава Валянціна Іосіфаўна,</u>*
*<u>29 год пасля заканчэння школы:</u>*

- У школе мне вельмі падабалася фізкультура, працоўнае навучанне, хімія і біялогія. Сёння я таксама прымаю ўдзел у спартакіядах, атрымліваю шмат узнагарод. Ніколі не любіла матэматыку, але зараз на рабоце прыходзіцца сутыкацца з лічбамі.

*<u>Буры Дзмітрый Аляксандравіч,</u>*
*<u>10 год пасля заканчэння школы:</u>*

- Школа – гэта нешта светлае і добрае. Мне тут падабалася… Я заўсёды любіў фізкультуру, матэматыку і фізіку. Я і сёння памятаю ўсе алімпіяды, апошні званок, свой выпускны… Гэта самае лепшае, што было ў маім жыцці… Кожны дзень як свята!!!

*Алена Цэнкель*














**Дом, у якім утульна ўсім!**

berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 27, люты 2016 г.*

*Знакамітыя выпускнікі*

# Яна дапамагае зберагаць здароўе…



***КАПІТОНАВА ЭЛЕАНОРА КУЗЬМІНІЧНА***
*Выпускніца 1968 года, залатая медалістка, урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, доктар медыцынскіх навук*

***Адукацыя***. Скончыла лячэбны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута (1968-1974 гады, дыплом з адзнакай); інтэрнатура і аспірантура па педыятрыі, педыятр вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі; курсы павышэння кваліфікацыі па розных раздзелах педыятрыі, клінічнай медыцыны і грамадскай аховы здароўя.

***Сфера навуковых інтарэсаў:*** праблемы харчавання, здароўе для здаровых, гастраэнтэралогія, алергалогія, нефаралогія.

***Дзейнасць.*** За гады сваёй актыўнай дзейнасці ў сферы аховы здароўя ў Беларусі прайшла паўнавартасны шлях ад участковага педыятра ў паліклініцы да кіраўніка ўстановы аховы здароўя. У 1996 годзе абараніла доктарскую дысертацыю, а ў 1997 годзе напісала праект па арганізацыі ў Гомелі Цэнтра здаровага дзіцяці, атрымала фінансаванне на яго рэалізацыю. У 2002 годзе была прызначана дырэктарам самага вялікага ў краіне навукова-практычнага Цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. У 2013 годзе арганізавала і ўзначаліла ААТ «Цэнтр аздараўленчага харчавання і спрыяння здароўю», дзе вядзе аўтарскія праграмы "Бацькам аб дзецях" і "Здаровае харчаванне і кіраванне вагой".



***Вопыт выкладчыцкай і кіраўнічай дзейнасці.*** На працягу 20 гадоў Элеанора Кузьмінічна Капітонава з'яўлялася асістэнтам, потым дацэнтам, загадчыкам, прафесарам. Пасля Чарнобыльскай аварыі ў Гомелі адкрылі медінстытут для падрыхтоўкі кадраў, дзе яна працавала прарэктарам па вучэбнай рабоце. У гэты ж час Элеанора Кузьмінічна займалася арганізацыяй кафедры і клінікі дзіцячых хвароб. З'яўляючыся дырэктарам клінікі дзіцячых хвароб медыцынскага ўніверсітэта, чытала лекцыі для студэнтаў на старэйшых курсах універсітэта, а гэтак жа для калег-педыятраў.

*(Заканчэнне на 4 старонцы)*

(Заканчэнне. Пачатак на 3 старонцы)

***Стажыроўкі і праектная дзейнасць.*** Стажыравалася па розных раздзелах педыятрыі ў лепшых клініках СССР (да 1991 года) і ў аўтарытэтных замежных клініках.

У рамках навукова-адукацыйных праграм пазнаёмілася з сістэмай аховы здароўя і медыцынскай адукацыі Вялікабрытаніі, Швецыі, Італіі, Францыі, ЗША. Прадстаўляла Беларусь на навуковых канферэнцыях у Расіі, Украіне, Швецыі, Швейцарыі, Аўстрыі, Сардзініі, Італіі, Шатландыі, Англіі, Індыі, на Мальце.

У 2002 – 2007гадах была экспертам Сусветнай Арганізацыі аховы Здароўя ад Рэспублікі Беларусь у групе «Здароўе» ў рамках Чарнобыльскага Форуму.

***Узнагароды.*** Мае шматлікія нацыянальныя і міжнародныя ўзнагароды за медыцынскую, навуковую, педагагічную і грамадскую дзейнасць. Сярод яе ўзнагарод: імянная прэмія Акадэміі медыцынскіх навук СССР (1982 год); ганаровае званне «Міжнародны вучоны 2001 года» Міжнароднага Біяграфічнага Цэнтра (Кембрыдж); узнагароды і гранты Каралеўскага Медыцынскага грамадства (Вялікабрытанія), фонду. Д. і К. МакАртуро (ЗША), Міжнароднага Савета па Даследаваннях і Абменах (ЗША).

Аб дзейнасці Капітонавай зняты дакументальны фільм на беларускім тэлебачанні, а таксама напісаны дзясяткі артыкулаў і інтэрв'ю ў СМІ. Яе біяграфія змешчана ў альманаху «Хто ёсць Хто ў Рэспубліцы Беларусь».

***Вось што Элеанора Кузьмінічна ўспамінае пра сваё дзяцінства і пра вучобу ў школе***



“Нарадзілася ў невялікім мястэчку Беразіно пад Мінскам, у сям'і настаўнікаў. Мама выкладала рускую мову і літаратуру, бацька – гісторыю. Сям'я была вялікай, але чацвёра старэйшых дзяцей ужо раз'ехаліся ў розныя бакі: хто вучыцца, хто працаваць. У сям'і засталіся мы ўдваіх са старэйшым братам. Дзяцінства ўспамінаецца як адзін вясёлы светлы дзень, напоўнены музыкай, кнігамі, апавяданнямі старэйшых, паходамі ў лес, на рэчку, школьнымі падзеямі, вучобай, канікуламі, хатнімі святамі. Дзецям у сельскай мясцовасці прывольна жывецца, і ў той жа час яны з ранняга ўзросту прызвычайваюцца да самастойнасці, пастаянных хатніх абавязкаў, адказнасці за сваю будучыню. Колькі сябе памятаю, пастаянна лячыла ўсіх: цацкі, сабак і катоў, сяброў-прыяцеляў, бацькоў. Самымі любімымі гульнямі былі «бальніца», уколы, склянкі з «лекамі», а ў больш старэйшым узросце – вопыты па хіміі і эксперыменты з раслінамі ў агародзе. Пасля такіх эксперыментаў часцяком «паддоследныя» расліны не выжывалі. У 8-ым класе ў рукі трапілася кніга «Справа, якой ты служыш», і лёс мой быў вырашаны: толькі медыцына. Бацькі спачатку ўзбунтаваліся, але потым змірыліся і ўсяляк спрыялі майму паступленню ў мединстытут. Вучылася я заўсёды без асаблівых намаганняў, таму што мне ўсё было цікава. Школу скончыла з залатым медалём і ў той жа год паступіла ў Гродзенскі медыцынскі інстытут. Мара спраўдзілася – я далучылася да медыцыны”.

*Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 27, люты 2016 г.***



# Цягніцеся да ведаў. Разумным быць - модна.




У нашай школе дзейнічае клуб "Эрудыт". Яго заняткі праводзіць Керына Галіна Шаркулаўна (намеснік дырэктара, настаўнік матэматыкі). Яна ўсё вельмі цікава распавядае, заўсёды вельмі весела. У клубе ёсць align="center"рознаўзроставыя каманды: "КЭШ", "Па барабану", "Чашы патыліцу" і "3 + 4".



На працягу года ўдзельнікі клуба вывучаюць крыжаванкі, сканворды, рэбусы, загадкі, анаграмы, шарады, лагагрыфы, амафоны, сінонімы. Для фарміравання навыкаў каманднага ўзаемадзеяння праведзены трэніровачныя гульні «Што? Дзе? Калі?», «Свая гульня», «Медыяазбука». Арганізаваны і праведзены раённы турнір інтэлектуальных гульняў. Таксама мы ездзім на гульні ў іншыя гарады: Мінск, Лагойск, Жодзіна, Чэрвень.

20 лютага каманды "КЭШ» і «Па барабану" ездзілі ў Мінск на "Кубак палітэха". Гэта было ў БНТУ. Там нас вельмі цёпла сустрэлі, расказалі пра навучальную ўстанову, усім вельмі спадабалася. Гульня была доўгай і цяжкай, але адначасова - цікавай і вясёлай.



27 лютага каманды "Чашы патыліцу", "Кэш" і "3 + 4" ездзілі ў Жодзіна на першы тур Чэмпіянату Мінскай вобласці сярод Юваналіі (навучэнцы да 9 класа ўключна). Там вельмі добрыя і ветлівыя людзі. Гульня была цікавай, яна прайшла хутка і займальна.

Гэта ўсё сапраўды вельмі весела і пазнавальна. Не сядзіце дома перад камп'ютарам, а лепш прыходзьце да нас на заняткі! І атрымаеце больш карысці, больш пазітыўных эмоцый і цікавай інфармацыі!!!

*Лізавета Вайцяховіч*





*Дом, у якім утульна ўсім!*

berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 27, люты 2016 г.*

# *«Шлях да поспеху праз творчасць настаўніка і вучня»*

З 20 па 27 лютага ў ДУА "Сярэдняя школа № 2" прайшоў метадычны тыдзень



Адкрыты ўрок грамадазнаўства «Канфліктныя і бесканфліктныя паводзіны» ў 9 «Б» класе праводзіць Казачонак А. М.



Адкрыты ўрок англійскай мовы «Славутасці Лондана» ў 7 «А» класе праводзіць Власюк Н. М.



Адкрыты ўрок англійскай мовы «Мой дом» ў 4 «Б» класе праводзіць Даніловіч В. В.



Удзел у навучальным семінары па тэме «Арганізацыя і суправаджэнне навукова-даследчай дзейнасці вучняў і педагагічных работнікаў». З педагогамі школы працуе выкладчык цэнтра дадатковай адукацыі «Альтэрнатыва» дацэнт кафедры педагогікі, кандыдат педагагічных навук Пунчык В. М.







Урокі ў школе І ступені праводзяць навучэнцы, якія наведваюць факультатыў «Уводзіны ў педагагічную прафесію»:
Поварава Яўгенія (10 "Б"), Аляхновіч Ангеліна (11 "А"), Джыгера Дар'я (11 "А")

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 27, люты 2016 г.

Правядзенне
школьнага этапу
навукова-практычнай канферэнцыі
«Навука. Прырода. Чалавек»










## *Як гэта: адзначаць дзень нараджэння 1 раз у 4 гады?*




2016 год - высакосны. Жывём на адзін дзень больш чым звычайна.

Вось некалькі цікавых фактаў пра высакосны год:

1. Шанцы нарадзіцца 29 лютага складаюць 1 на 1461. Ва ўсім свеце каля 5 мільёнаў людзей нарадзіліся ў гэты дзень.

2. Шматлікія стагоддзі астролагі лічылі, што дзеці, народжаныя ў высакосны дзень, валодаюць незвычайным талентам і нават адмысловай сілай. Сярод вядомых людзей, якія нарадзіліся 29 лютага, можна назваць паэта Лорда Байрана, кампазітара Джаакіна Расіні, актрысу Ірыну Купчанка.



Наскавец Марыя, вучаніца 6 "А" класа, нарадзілася 29 лютага. І вось як яна адносіцца да гэтага дня:

- На гэта можна паглядзець з двух бакоў. Так, непрыемна, што мой дзень нараджэння бывае адзін раз у чатыры гады. А з іншага боку, гэты дзень асаблівы. Калі год не высакосны, то я адзначаю дзень нараджэння 28 лютага.

# Вучань года – 2016











ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Галуза Яўгенія, Цэнкель Алена, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына